

# ДЗЕ ТЫ, РОДНАЯ ЗЯМЕЛЬКА,
# І ДЗЯЦІНСТВА МОЙ КУТОК…


…Як бы ні склаўся твой лёс,
куды б ні завялі дарогі,
заўсёды з удзячнасцю і
пяшчотай ты будзеш
успамінаць маці і бацьку, дом,
дзе ты нарадзіўся і рос,
родныя мясціны, сцяжынкі
дзяцінства, сваю маленькую
радзіму .
Наша Радзіма– г.п.Рось…

Посмотрите, люди,
На холмы и дали.
Разве лучше Росси
Место вы видали?

Разве лучше Росси
В мире есть местечко.
Где так живописны
Склоны, парк и речка?

Где стоят, как струны,
Тонкие березы,
Где гремят ночами
Золотые грозы.

И где небо плачет
Светлыми слезами,
Васильки смеются
Синими глазами.
Юлия Залущик.








***Рось – гарадскі пасёлак, на р. Рось, за 17 км ад горада Ваўкавыска.***

***Упершыню паселішча Рось узгадваецца пад 1205 годам. У гэты час яно было падзелена на 2 асады. 1-я асада належала Іллінічу, 2-я асада - Яновічу, якія надавалі вялікае значэнне вайсковай справе. Дзякуючы ім, нашчадкамі Ілініча і Яновіча была створана Роская дружына. Яна складалася са 100 ваяроў (кожны рыцар меў па 1-2 зброеносцы) і прыняла чынны ўдзел у Грунвальдскай бітве 15 ліпеня 1410г. у складзе Ваўкавыскай харугвы.***
***За храбрасць і страты на грунвальдскіх палях Роская дружына атрымала герб - Анёл з мячом на чырвоным шчыце. З цягам часу ён становіцца гербам мястэчка Рось.***










Ангел! Кто ты?
Ты явился
В час затменья
Предо мной.
Ангел жизни?
Ангел смерти?
Ангел с поднятым
мечом.
Предсказав победу в
битве
Ты повел нас в бой с
врагом
Ты свободы вечной
символ,
Земли Росской, ангел
мой.

Лариса Иванчукова

**Заснаванне маёнтка Рось было, безумоўна, звязана з яго зручным геаграфічным становішчам уздоўж сплаўнай ракі, непадалёку ад такой важнай гандлёвай артэрыі як Нёман.**







**Першым бясспрэчным прыватным уладальнікам Росі быў фундатар манастыра ў Супрасле (Беласточчына) маршалак гаспадарскі і ваявода навагародскі магнат Аляксандр Хадкевіч (1457-1549).**



У розныя гады Рось пераходзіла ў спадчыну Яну Ракоўскаму, Юрыю Каралю Глябовічу, Агінскім, Крысціне Сапега, Мікалаю Браніцкаму, Патоцкім.

У канцы XVIст. у Росі пачынае фарміравацца мястэчка.У 1690 годзе тут налічвалася 25 двароў і 2 карчмы .

Пасля 3-га падзелу Рэчы Паспалітай(1795) у Слонімскай, Літоўскай, з 1801 г. у Гродзенскай губерні, цэнтр Роскай воласці Ваўкавыскага павета.



Палац з 20-х гадоў XVIIIст. размяшчаўся ў глыбіні вялікага парка. Гэта быў вялізны драўляны будынак на высокім цагляным падмурку. У палацы захоўвалася вялікая бібліятэка, архіў, калекцыя абразоў XVI – XIX ст. Сярод рэчаў цікавай была калекцыя вайсковых трафеяў XVIII ст. Аснову кампазіцыі складала водная сістэма, з’яднаная з р.Рось. У XVIII ст. быў закладзены парк.



Сядзіба Патоцкіх у г.п.Рось. Малюнак Напалеона Орды.



Роскі парк – гэта помнік садова – паркавага мастацтва 19 ст., плошчай больш за 15 га, які ў 1820-1830-ыя гг. займаў 5-е месца ў Еўропе па прыгажосці і велічы. Парк пейзажнага тыпу з элементамі рэгулярнай планіроўкі, з дэкаратыўнымі альтанкамі.

У парку была створана арыгінальная гідратэхнічная сістэма, якая складалася з сажалак, канала, выкладзенага белай кафляй, ручая, каскада. Цэнтрам яе быў кальцавы канал, які акружаў востраў. Ад яго разыходзіліся тры каналы.

За паркам прыглядаў садоўнік, дом якога захаваўся да нашых дзён.





На тэрыторыі маёнтка на р. Рось пабудаваны млын з 6 коламі, які дзейнічае ў наш час.



Много помнит тенистый парк
Про балы и обеды в усадьбе,
И про то, как играла форель,
На влюбленные пары глядя.
И сегодня шумит водопад,
Привлекая гостей и хозяев,
И у мельницы, там, где каскад,
Мы, столетья спустя, гуляем.
Нет сегодня усадьбы былой,
Нет форели в каналах парка,
Все спешим мы: ритм жизни такой,
Но чего - то нам все же жалко…

Алина Дайлида.




**У 1611 годзе Геранім Хадкевіч, віленскі кашталян фундаваў у дворскім парку драўляны касцёл, пажалаваўшы яго фальваркам Гарасімовічы (Плябанаўцы). Другі касцёл, таксама драўляны, на месцы былога, у 1685 годзе фундуе Марціан Агіньскі, уласціцель Росі, у пазнейшым віленскі ваявода.**

**Калі і гэты пераўтварыўся ў руіны, у 1776 годзе Францішак Патоцкі збудаваў новы, мураваны ў самым мястэчку. Калі муры былі ўзнесены да акон, будоўля прыпынілася. Толькі ў 1807 годзе на фундаменце папярэдняй будоўлі, але ўжо па новым праекце, касцёл нарэшце паўстаў у рэнесансавым стылі і існуе па сённяшні дзень.**





У 1908г. асобна ў межах агароджы касцёла пастаўлена 2-ярусная мураваная званіца. Адзін са званоў роскага касцёла быў адліты ў 1713г. у г. Каралеўцы (Кёнігсберге).

Касцёл Найсвяцейшай Тройцы – помнік архітэктуры позняга класіцызму. Унутры прадаўгаватая зала перакрыта драўляным цыліндрычным скляпеннем, уздоўж асновы якога праходзіць абходная галерэя і масіўны карніз. Пры ўваходзе залу перасякае пастаўленая на 4 калоны галерэя хораў з арганам.
















У гэтым храме знаходзіцца драўляная цудатворная фігура Ісуса. Усяго ў свеце налічваецца толькі тры скульптуры Хрыста ў сядзячай позе, адна з іх – у Роскім касцёле. Інвентарныя запісы сведчаць, што прывезена яна з гор Лівана, а першы цуд, які зафіксаваны гісторыкамі, адбыўся з яе дапамогай у 1618 г., калі да сляпой жанчыны, пасля шчырай малітвы вярнуўся зрок, яна зноў атрымала дар бачыць. Найбольш пілігрымаў да фігуры Ісуса Хрыста Смуткуючага кожны год фіксуецца на свята Сашэсця Святога Духа.

На скляпенні левага трансепта – абраз 17 ст. “Маці Божая з дзіцем”.

Асаблівую цікавасць выклікае саркафаг Соф’і Пац з белага мармуру. Ён быў выраблены ў далёкай Італіі майстрам Джуліо Маскеці і, за вялікія грошы, прывезены ў Рось. Гэта ўнікальны скульптурны рарытэт, аналагаў якому няма ў Беларусі.

**Капліца пад назвай святога Стэфана пабудавана графам Патоцкім у 1907 годзе на каталіцкіх могілках як маўзалей для сябе і будучых роскіх ардынатаў (ардынат – уладальнік ардынацыі, уласнасці магнацкага роду ў Рэчы Паспалітай). Капліца збудавана з чырвонай цэглы  з абшырным склепам. Памёр граф у 1910 годзе і пахаваны згодна яго жаданню.**





Дакладнай даты ўзнікнення першай царквы ў Росі адшукаць не ўдалося. Вядома толькі, што ў 1569г. ў сядзібным парку драўляная царква ўжо стаяла. Празвана яна была ў гонар святога Іллі, у якой было 19 ікон, з якіх 11 знаходзіліся ў царскіх варотах. На званіцы меліся два званы.

Пазнейшая, таксама драўляная царква, была пабудавана па-за паркам уладальнікам Росі Янам Ракоўскім.







У пачатку ХХст. гэтую царкву разабралі, паставіўшы на яе месцы новую, мураваную. Пабудаваць яе дапамог Стэфан Патоцкі.





**Калі ў 1908 г. узвялі Свята-Троіцкую каменную царкву, старую праваслаўную царкву перанеслі на могілкі і зрабілі капліцай. Апошняя згарэла ў час Другой сусветнай вайны. Свята-Троіцкі храм-помнік архітэктуры псеўдарускага стылю, быў асвечаны ў 1911 г. На двухярусна́й вежы-званіцы знаходзяцца 3 званы: вялікі-вагай 335 кг, быў адліты ў 1930 г. Усе званы былі адліты ў г.Данцыг. Іканастас драўляны. У храме захоўваецца абраз мяжы XVII-XVIII ст. ,,Маці Божая Адзігітрыя''.**





**Много ли, скажите, или мало**
**Два столетья людям прослужить.**
**Скольких здесь крестили и венчали,**
**И в последний путь спешили проводить!**
**Скольким здесь сполна грехи прощались,**
**И надежда в сердце появлялась вновь.**
**Сколько мудрых поучений прозвучало**
**Про могущество Господне и любовь!**
**С трепетом входя под своды Храма,**
**И колени молча преклонив,**
**Все дела, обиды, взлеты, драмы**
**Богу отдаём, прощенья попросив.**
**На лице Христа - печаль и горечь,**
**Знать немало согрешили люди...**
**Уповаем на Его совет и помощь,**
**Верим, что услышана молитва будет.**
**К храму путь у каждого нелегок,**
**Но к святому тянется душа.**
**Стань, и призадумайся, мой друг, немного.**
**Жизнь свою осмысли неспеша…**

**Алина Дайлида.**






**Роская сінагога адчыніла свае дзверы ў 1910 г. Гэта цагляны неатынкаваны дом. На фасадзе захавалася рэльефнае адлюстраванне меноры. Сінагога належала іудзейскай абшчыне Росі. У пачатку ХХ ст. у мястэчку пражывала 1030 жыхароў, з іх 398 былі яўрэямі.**

**Па словах сведкаў, у часы нямецка- фашысцкай акупацыі ўсіх яўрэяў сагналі на рыначную плошчу. Там нацысты расклалі вялікае вогнішча, дзе спалілі ўсе іудзейскія кнігі і іншыя культавыя прадметы з сінагогі. Праз два дні роскіх іудзеяў вывезлі на фурманках у Ваўкавыскае гета. Далейшы іх лёс невядомы. З тых часоў перастала дзейнічаць і Роская сінагога.**

**У будынку сінагогі на сённяшні дзень працуе кафэ.**

**На вуліцы Савецкай, у скверы 40-годдзя Перамогі знаходзіцца брацкая магіла савецкіх воінаў і партызан, дзе пахаваны 392 воіны, якія загінулі ў баях з нямецка-фашысцкімі захопнікамі ў 1941-1944 гг.**





**Сярод пахаваных воіны 238-й стралковай дывізіі 3-й арміі 2-га Беларускага фронту, якія загінулі ў ліпені 1944 г. пры фарсіраванні ракі Рось і вызваленні гарадскога пасёлка. У 1948 г. на магіле пастаўлены абеліск, у 1985 г. рэканструяваны.**






**У пасёлку працуюць камбікормавы завод, Племзавод “Рось”, лясніцтва, 2 сярэднія школы, Дзіцячая школа мастацтваў, Дом культуры.**











Для ваеннаслужачых у 1992-1997 гг. пабудаваны жылы гарадок. Архітэктары праекту: Г.І.Белікаў, У.М.Еўдакімаў, В.К.Карунас, Ю.М.Малевіч, А.І.Нічкасаў, А.С.Пархута, У.Б.Праабра-жэнскі, У.М.Тарноўскі ўзнага-роджаны Дзяржаўнай прэміяй Рэспублікі Беларусь 1998 г.









**Гарадок уключае ўсё неабходнае для жыхароў: бальнічны комплекс, школу, дзіцячы сад, гандлёвы цэнтр, банк, дом быта, бібліятэку, Раённы цэнтр рамёстваў.**

# *Мой городок.*

**Осенний кружится листок,**
**И стало тише…**
**Мой засыпает городок,**
**И дождь по крышам…**
**Закрыв все арки и дворы,**
**И слёз не пряча,**
**Устав от смеха детворы,**
**Здесь осень плачет…**
**Слезами чистыми ручьи**
**Сольются в реки.**
**И ночь погасит фонари**
**У ночной аптеки.**







**И я поговорю с дождём**
**О светлой грусти…**
**И он, растрогавшись, уйдёт,**
**Меня отпустит…**
**Мой засыпает городок**
**В объятьях ночи,**
**И он со мной не одинок,**
**Любимый очень!**

***Светлана Свиридова.***





**Да жніўня 2010 года ў Росі была размешчана Радамская 116-я гвардзейская бамбардзіровачная авіяцыйная база.**



Люблю я Россь,
свой край родной
За добрый люд и бег коней.
И слушать летнею порой
Как песнь поет красавец-соловей.
Люблю я речку,
где провел все лето,
Её прекрасной глади блеск.

Я не могу забыть про это,
Когда в костре звучит дровишек треск.
Есть в Росси парк, который так прекрасен,
Весною, когда всё вокруг цветет.
И лишь недавно стал мне так понятен
Тот факт, что Россь давным-давно живет…

Павел Емелин.

















***Родная Рось! Мы любім цябе такую розную - таямнічую сярэдневяковую, прыгожую  і сучасную…***

***Ты наш - гонар, наша мінулае і наша будучыня!***



Я харошых краёў бачыў
многа,
Многа пройдзена дальніх
дарог,
А найлепшая тая дарога,
Што вядзе на бацькоўскі
парог!

Кажуць, дома вуглы
памагаюць,
Дома жыць і рабіць
весялей…
Чалавек без бацькоўскага
краю
Як без песні ў гаі салавей!

Тут і сонца, здаецца,
святлейшае свеціць,
І дабрэйшыя ўсмешкі ў
добрых людзей,
Есць нямала зямель
багацейшых на свеце,
Толькі ты мне радней,
даражэй і мілей!

А.Бялевіч